ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
24
ЛІСТАПАДА
СУБОТА
№ 32 (1445)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
мэлетаип
• Учора • Сёння • Заўтра •

## НА СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ

савета кафедраў грамадскіх навук і бюро камітэта камсамола ішла размова аб удасканаленні асноўных форм работы камітэта камсамола з кафедрамі грамадскіх навук па камуністычнаму выхаванню моладзі. Адзначалася, што ў дасягненні творчага засваення студэнцкай моладдзю ідэй марксізму-ленінізму, выхаванні ў яе камуністычнай перакананасці, высокіх маральных якасцей важную ролю адыгрывае мэтанакіраваная, добра скаардынаваная работа кафедраў грамадскіх навук і камсамольскіх арганізацый.

По абмеркаванаму пытанню прынята адпаведнае рашэнне.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

## II АБЛАСНАЯ ВЫСТАЎКА

навукова-тэхнічнай творчасці моладзі «НТТМ-85» будзе праходзіць у Мінску з 10 па 30 студзеня наступнага года.

Асноўнай мэтай выстаўкі з'яўляецца прапаганда лепшых дасягненняў маладых вучоных і спецыялістаў, рабочых і калгаснікаў, студэнтаў і школьнікаў у вырашэнні задач паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу ў народнай гаспадарцы, далейшае развіццё творчай ініцыятывы моладзі.

Савет па НДРС універсітэта просіць падаваць тэматычны план паказу дасягненняў маладых наватараў на абласной выстаўцы «НТТМ-85». Форма тэматычнага плана знаходзіцца ў саветах маладых вучоных падраздзяленняў і савеце па НДРС універсітэта.

А. НІКІЦЕНКА.

## СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЯ

канферэнцыя спартыўнага клуба адбылася ва універсітэце. Са справаздачным дакладам выступіў старшыня спортклуба А. С. Балдзін.

У. АБРАМОВІЧ.

## НА ЧЭМПІЯНАЦЕ БССР

па баскетболу пасля першага тура лідзіруе другая каманда Мінска, за якую выступаюць баскетбалісткі універсітэта. Мінчанкі ўпэўнена перамаглі каманды Брэсцкай, Гродзенскай і Гомельскай абласцей.

В. ШХІНЬЯН.

## СЯРЭБРАНЫ МЕДАЛЬ

на чэмпіянаце Еўропы па мастацкай гімнастыцы ў групавых практыкаваннях заваявала зборная СССР, у саставе якой выступала студэнтка факультэта журналістыкі Вольга Кісялёва.

І. УЛАДЗІМІРАЎ.




## КАМСАМОЛЕЦ!

ТЫ ВЫБРАНЫ дэлегатам на XXXI камсамольскую канферэнцыю Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Сёння табе ў ліку іншых дэлегатаў 11-тысячнага камсамольскага атрада даверана ацаніць работу камітэта камсамола універсітэта, вызначыць канкрэтныя шляхі далейшага павышэння баявітасці камсамольскіх арганізацый, ролі камсамола ў справе камуністычнага выхавання моладзі. Прайшоўшыя 1983 і 1984 гады азнаменаваліся новымі поспехамі камсамольцаў універсітэта ў вучобе і працы. На ўсіх участках камуністычнага будаўніцтва, ва ўсіх справах адчуваецца ўпэўнены поступ XI пяцігодкі, у выкананне планаў якой уліваецца і твая праца — вучоба студэнта, маладога вучонага, байца студэнцкага будаўнічага атрада. Гэта ты ўкладваў новыя кіламетры шпалаў БАМа. Гэта ты, нягледзячы на дождж, дапамагаў убіраць «другі» хлеб на палях калгасаў і саўгасаў Магілёўшчыны і Міншчыны. Гэта твае выступленні з канцэртамі мастацкай самадзейнасці і лекцыямі добра памятаюць у падшэфных школах і прафтэхвучылішчах, у домакіраўніцтвах і воінскіх часцях. Гэта твой мацярынскі клопат памятаюць дзеці дзіцячых дамоў і дамоў малюткі.

Табе, сучаснік, выпаў гонар вучыцца, працаваць, працягваць справу, пачатую бацькамі, тую справу, дзеля якой яны жылі і змагаліся, якую абаранялі да апошняга дыхання. На подзвігу бацькоў і дзядоў ты вучышся адвазе і мужнасці, у тваёй памяці жывуць старонкі самаадданай працы першабудаўнікоў сацыялізму. Ты ганарышся пакарыцелямі цаліны, творцамі індустрыяльнай дзяржавы.

Рыхтуючыся да дастойнай сустрэчы 40-годдзя Перамогі савецкага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі, вучыся, жыві і працуй па-ленінску, усе сілы, энергію аддавай служэнню Радзіме!

Прагрэсіўная моладзь усяго свету рыхтуецца да XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў. Падтрымлівай і развівай слаўныя інтэрнацыянальныя традыцыі Ленінскага камсамола!

Няхай ленінскі запавет «вучыцца камунізму» стане зместам твайго жыцця, таварыш дэлегат! Поспехаў табе ў працы, добрага настрою, прагі да ведаў, новых здзяйсненняў на карысць вялікай Радзімы!

Справаздачны даклад камітэта камсамола, выступленні дэлегатаў канферэнцыі, гэты нумар газеты дапамогуць табе, таварыш, вызначыць найбольш эфектыўныя формы і метады работы па паспяховаму выкананню задач, што стаяць перад камсамольскай арганізацыяй універсітэта.

## САРДЭЧНА ВІТАЕМ ДЭЛЕГАТАЎ XXXI СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЙ КАМСАМОЛЬСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА!

● У 1983-84 навучальным годзе сярэдняя паспяховасць студэнтаў склала ў першым семестры — 91,58 працэнта, у другім — 91,6 працэнта.

● Сярод камсамольцаў універсітэта 20 імянных стыпендыятаў.

● У 1983-84 навучальным годзе ўсімі формамі НДРС у БДУ імя У. І. Леніна было ахоплена 6.057 студэнтаў дзённай формы навучання, што складае 67 працэнтаў ад агульнай колькасці студэнтаў стацыянара.

● Па выніках навукова-даследчай работы студэнтамі было пададзена 20 заяў на вынаходніцтвы. Шэсць з іх атрымалі станоўчыя рашэнні, апублікаваны ў сааўтарстве з выкладчыкамі і навуковымі супрацоўнікамі універсітэта 393 навуковыя артыкулы.

# СКРОЗЬ ПРЫЗМУ ЛІЧБАЎ І ФАКТАЎ

● Больш як 4.000 студэнтаў выступілі з навуковымі дакладамі на канферэнцыях універсітэта і іншых ВНУ краіны.

● На Усесаюзны агляд-конкурс па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках было пададзена 57 навуковых работ. Дзве з іх адзначаны медалямі Усесаюзнага конкурсу. Іх аўтары — студэнт механіка-матэматычнага факультэта Ю. Дракахруст і студэнт факультэта прыкладной матэматыкі А. Кадан. 6 студэнтаў адзначаны дыпломамі МінВНУ СССР і ЦК ВЛКСМ.

● Зараз ва універсітэце функцыяніруе 16 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый. Аб'ём работ СНДЛ складае каля 400 тысяч рублёў.

● Агялдам якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з'явілася Усесаюзная алімпіяда «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». У першым туры алімпіяды прынялі ўдзел ва ўсіх прадметных алімпіядах і конкурсах па спецыяльнасці 7.672 студэнты. У другім туры ўдзельнічала 40 чалавек.

● Па выніках другога тура алімпіяды каманды БДУ імя У. І. Леніна ўзнагароджаны граматамі ЦК ЛКСМБ за першыя месцы па матэматыцы, фізіцы, рускай мове і літаратуры, праграміраванню і ЭВМ, рускай мове (сярод замежных студэнтаў), правазнаўству.

● У асабістым заліку другога тура студэнты БДУ занялі 26 прызавых месц.

● Паспяховасць студэнтаў па грамадскіх навуках склала ў 1983-84 навучальным годзе 98,6 працэнта, у тым ліку на «добра» і «выдатна» — 75 працэнтаў.

● Эфектыўнай формай выхавання ў будучых спецыялістаў творчага падыходу да вывучэння марксісцка-ленінскай творчай спадчыны стаў традыцыйны Усесаюзны конкурс студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. У ім прынялі ўдзел 98 працэнтаў савецкіх і 60 працэнтаў замежных студэнтаў. На рэспубліканскі тур было пададзена 40 работ, з іх 28 атрымалі адзнаку «выдатна», 12 — «добра», 5 работ прадстаўлялі запоўнены маладзёжную тэматыку і ўсе яны атрымалі ацэнку «выдатна».

## ● ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА КАМСАМОЛАМ ●

# СТАНАЎЛЕННЕ

**Пастанова ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні кіраўніцтва камсамолам і павышэнні яго ролі ў камуністычным выхаванні моладзі» стала праграмным дакументам партыйных арганізацый у справе актывізацыі камсамольскага жыцця: падрыхтоўкі юнакоў і дзяўчат да адказнай грамадскай дзейнасці.**

КАМСАМОЛЬСКАЯ арганізацыя БДУ — гэта моцны, высокаарганізаваны, палітычна свядомы калектыў моладзі з вялікімі традыцыямі, важкімі здабыткамі. Многія пакаленні выпускнікоў, якія самааддана працуюць у нашай рэспубліцы і далёка за яе межамі, ганарацца тым, што іх юнацтва прайшло ў камсамольскай арганізацыі універсітэта.

Але зараз размова аб тым, што новага ўносіць у камсамольскае жыццё сённяшні дзень, як партыйная арганізацыя накіроўвае энергію студэнцкай моладзі на актыўны ўдзел у сацыяльных працэсах. Партыйны камітэт універсітэта разам з камітэтам камсамола працуюць над тым, каб усямерна актывізаваць навучальна-выхаваўчы працэс у студэнцкай групе. Гэта тая камсамольская ячэйка, ад актыўнасці якой залежыць канчатковы вынік — фарміраванне кваліфікаванага, ідэйна загартаванага спецыяліста.

Таму партком і партыйныя бюро факультэтаў вельмі ўважліва падыходзяць да фарміравання актыву групы. Ад гэтага залежыць поспех усёй справы. Камсоргамі, праофоргамі, старастамі выбіраюцца маладыя камуністы, людзі з жыццёвым вопытам, арганізатарскімі здольнасцямі. Моцны актыў устанаўлівае трывалыя і дзейсныя сувязі групы з партыйнай арганізацыяй, дэканатам, асноўнымі падраздзяленнямі факультэтаў, становіца уплывае на павышэнне адказнасці кожнага камсамольца за вучобу і свае грамадскія абавязкі.

Сёлета камсоргамі выбраны 52 маладыя камуністы, а ўсяго ў студэнцкім камсамольскім актыве працуе 191 камуніст. Гэта вялікая і актыўная сіла, на якую партком апіраецца ў рабоце са студэнтамі.

Існуе заканамернасць: у тых групах, дзе зладжана працуе актыў, — за ім ідуць усе студэнты. Тут высокая паспяховасць, моладзь займаецца навуковай працай, добрасумленна выконвае грамадскія даручэнні, удзельнічае ў рабоце будаўнічых атрадаў. Гэта калектывы тавырышаў, аднадумцаў, моцныя палітычнай свядомасцю і грамадзянскай пазіцыяй.

Мы ўпэўнены, што прамыя сувязі з вучэбнымі камсамольскімі групамі неабходна развіваць і надалей: група — камітэт камсамола, партыйнае бюро, дэканат, партком, рэктарат. А каб змацаваць гэту сувязь жывымі і шчырымі адносінамі, трэба не шкадаваць ні сіл, ні часу. Будучыя спецыялісты адздзячаць за гэта самааддай працай на карысць Радзімы.

Стала добрым правілам выбіраць камсамольцаў у партыйныя бюро, кіруючыя органы розных грамадскіх арганізацый і фарміраванняў. Студэнцтва ажыўляе дзейнасць гэтых арганізацый сваімі надзённымі клопатамі, уласцівым маладосці запалам. З другога боку, кожны студэнт набывае вельмі карысны вопыт грамадскай работы.

Камітэт камсамола універсітэта, напрыклад, плённа працуе разам з саветам ветэранаў вайны. Гэтыя сувязі складваліся не адзін год і дзякуючы камуністам-ветэранам сталі дзейсным фактарам патрыятычнага выхавання.

Цяпер савет ветэранаў і камітэт камсамола рыхтуюцца да сустрэчы 40-годдзя Вялікай Перамогі. Галоўны ўпор у гэтай рабоце робіцца на ўслаўленне неўміручага подзвігу савецкага народа, пераемнасць гераічных традыцый, выхаванне ў моладзі пачуцця адказнасці за ахову сацыялістычных заваёў. Заслугі ветэранаў перад Радзімай, іх гераічны ваенны і мужны грамадзянскі лёс вельмі моцна ўздзейнічаюць на моладзь.

Партыйны камітэт заўсёды аказвае дапамогу камітэту камсамола ў падрыхтоўцы і правядзенні культурна-масавых і ідэйна-палітычных мерапрыемстваў, арыентуючыся не на колькасць розных акцый, а на якасць, высокае ідэйнае ўздзеянне на студэнтаў. Станоўчы вопыт правядзення такіх мерапрыемстваў у камсамола універсітэта даволі багаты. Напрыклад, стала традыцыйным купалаўскае свята ў Вязынцы. Яно выходзіць ужо за рамкі універсітэцкага мерапрыемства. Штогод праводзяцца злёты студэнцкіх будаўнічых атрадаў, злёты турыстаў, выдатнікаў вучобы, фестывалі мастацкай самадзейнасці... Цікавымі падзеямі сталі дні факультэтаў:

## ● МЫ ГАЛАСУЕМ ЗА МІР! ●




ЗА МІР ПАТРЭБНА ЗМАГАЦЦА. Для кожнага з нас няма сёння пытання больш важнага, чым прадухіленне ядзернай вайны, забеспячэнне мірных умоў для стваральнай працы.

У гэтыя трывожныя дні, калі на планеце ўжо палыхаюць пажары лакальных войнаў, калі над светам навісла чорная хмара ядзернага смерча, студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта далучаюць свае галасы да галасоў усіх людзей Зямлі, якія выступаюць супраць гонкі ўзбраенняў, супраць ядзернага вар'яцтва, за мір і жыццё.

**НА ЗДЫМКУ: удзельніцы мітынгу студэнцкай моладзі Мінска ў рамках Тыдня дзеянняў за раззбраенне, абвешчанага па рашэнню ААН і Сусветнага Савета Міру, камсамолкі геаграфічнага факультэта Ірына Дрэваль, Наталля Генава, Валянціна Уласень.**

**Фота В. Драчова.**

## ● РАЗВАЖАЮЦЬ УДЗЕЛЬНІКІ КАНФЕРЭНЦЫІ ●

# З ЧАГО ПАЧЫНАЕЦЦА ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ?

**ЛЕНІНСКАМУ камсамолу — 66 гадоў. За гэты час змянілася шмат пакаленняў. А што вызначае камсамольскае пакаленне 80-х! Чым жывуць камсамольцы нашага універсітэта? З гэтым пытаннем наш карэспандэнт звярнулася да сакратара камітэта камсамола юрыдычнага факультэта Марыны ТКАЧУК:**

— НЯРЭДКА Ў КАМІТЭТАХ камсамола, у дэканатах, партыйных бюро гавораць аб тым, што пасіўныя нашы камсамольцы. Нічым іх не зацікавіш, нішто іх не хвалюе. А дзе ж была камсамольская арганізацыя, калі студэнт прыйшоў на першы курс? Што зрабіла яна для таго, каб першакурснік хутка ўліўся ў студэнцкае жыццё? Не будзем спрачацца, што першакурснік — гэта асаблівая катэгорыя студэнтаў не толькі таму, што іх можна «дэсантыраваць» на суботнік, на іх жа «выехаць» на дружыне або паслаць на незразумелае мерапрыемства толькі таму, што патрэбна запоўніць залу... Студэнт-першакурснік разумее, што і гэтыя мерапрыемствы патрэбны, але яму хочацца выказаць сваё асабістае «я». І вось як да гэтага «я» прыслухаюцца на першым курсе, — у многім залежаць актыўнасць або пасіўнасць ужо на курсе другім, трэцім...

У студэнцкі клуб «Верасень» прыходзяць усе: і ўмудроныя вопытам пяцікурснікі, і навічкі-першакурснікі. Што прыцягвае іх сюды? Перш за ўсё выкажам бясспрэчную ісціну. Пяцікурснік быў калісьці першакурснікам. І вось як прынялі яго тут на першым курсе — так і склаліся яго адносіны з клубам на працягу пяці гадоў.

Нехая зайшлі ў камітэт камсамола юнакі з першага курса.

— Мы параіліся: ня́дрэнна было б стварыць на факультэце вакальна-інструментальны ансамбль, — нясмела выказалі сваю прапанову.

І ў камітэце іх падтрымалі. Вядома, будзе ў юнакоў жаданне працаваць.

Цудоўна працаваў летам камуністычны атрад «З ліпеня» ў дзіцячым доме. Бо таксама не была пакінута без увагі ініцыятыва камсамольцаў 4-га курса Наталлі Каншынай, Вольгі Марчанкавай, Вікторыі Беразавенка, Наталлі Бадулінай па стварэнню атрада.

Знаёмства з клубам «Верасень»—не адзіны сродак камсамольскай арганізацыі юрыдычнага факультэта па прыцягненню першакурснікаў у студэнцкае жыццё. Праявіць свае таленты яны могуць на вечары мастацкай самадзейнасці, дзе кожны курс выступае са сваёй канцэртнай праграмай. А потым вечар знаёмстваў «Ці хочаш ты быць байцом СБА?». І што такое ФГП, раскажуць першакурснікам сярэйшыя тавырышы. І да сесіі дапамогуць падрыхтавацца. Праходзяць гэтыя мерапрыемствы не для справаздачы, а на карысць справе. І наўрад ці пакінуць яны каго-небудзь абыякавым.

У мінулым годзе пачался супрацоўніцтва камсамольскіх груп факультэта з групамі навучэнцаў ГПТВ № 53. Шмат чаго не атрымлівалася, шмат было нараканняў на нашу работу. Сёлета за справу ўзяліся больш сур'ёзна. Ёсць першыя вынікі. У ГПТВ прайшоў вечар першакурсніка. Там мы выступілі з канцэртнай праграмай, а рабяты з вучылішча арганізавалі дыскатэку. І нам было цікава, і ў вучылішчы засталіся задаволенымі.

Шмат ёсць цікавых прапаноў у камсамольцаў, у камітэта камсамола. Часта звяртаемся за дапамогай у дэканат, партыйнае бюро. Але не таму, што камітэт камсамола патрабуе нейкай апекі, а проста мы ўпэўнены: старэйшыя тавырышы параяць, як зрабіць лепш.

У дэканаце вырашалася пытанне наконт таго, каб на чацвёртым курсе праводзіць заняткі ў другую змену. Але пасля таго, як правялі сход старастаў, як разгледзелі гэта пытанне на пасяджэнні камітэта камсамола — прыйшлі да агульнага меркавання: такія змены рабіць немэтазгодна.

Вось так, з агульнай зацікаўленасці пачынаецца кожная справа на юрфаку. І не трэба лічыць, што няма тут праблем, што няма тут над чым працаваць камітэту камсамола, дэканату, партыйнаму бюро. Праблем шмат, але на факультэце настроены на тое, каб вырашаць іх.

# ГРАМАДЗЯНІНА

хімічнага, фізічнага, матэматычнага і г. д. Кожнае такое мерапрыемства пакідае глыбокі след у душы студэнта, захапляе яго, ён становіцца актыўным удзельнікам універсітэцкага жыцця.

Партыйны камітэт і ўсе партыйныя арганізацыі ўважліва ставяцца да ініцыятывы камсамольцаў, імкнуцца не толькі падтрымаць, але і развіць яе. Гэта садзейнічае росту эфектыўнасці камсамольскіх мерапрыемстваў, аказвае выхаваўчае ўздзеянне на студэнтаў.

Яркім праяўленнем дзейснасці такой работы з'явілася арганізацыя і правядзенне 1 верасня ва універсітэце ўсенароднага свята — Дня ведаў. Камітэт камсамола распрацаваў сцэнарый свята з улікам універсітэцкіх традыцый. Першакурснікі сустрэліся з кіраўніцтвам факультэтаў, затым на плошчы перад галоўным корпусам іх віталі рэктар універсітэта, шматлікія госці. Яны атрымалі сімвалічны ключ ведаў, студэнцкі білет, запалілі факел ведаў, далі клятву выдатна вучыцца і верна служыць Радзіме; пад мноствам памятных сцягоў прайшлі ў актавую залу, дзе праслаўленыя калектывы мастацкай самадзейнасці паказалі сваё майстэрства.

Лаканічны пераказ не адлюстроўвае эмацыянальнага напружання свята, узнёслага настрою яго ўдзельнікаў, але ёсць усе падставы лічыць, што гэты рытуал пакінуў след у сэрцы кожнага першакурсніка. Значыць, мэта Дня ведаў дасягнута.

Гэта вынік аб'яднаных намаганняў партыйных, прафсаюзных арганізацый, дэканатаў, якія не толькі падтрымалі камітэт камсамола, але і самі прынялі ўдзел у правядзенні Дня ведаў. Пастанова ЦК КПСС якраз і арыентуе партыйныя арганізацыі не рэгістраваць дзейнасць камсамола, а мудра накіроўваць, дзейсна дапамагаць; камуністы павінны працаваць з камсамолам і ў камсамоле. Камсамольскія арганізацыі юрыдычнага, хімічнага, філалагічнага факультэтаў займаюць прызавыя месцы ў сацыялістычным спаборніцтве, таму што партыйныя бюро і дэканаты адводзяць камітэтам камсамола першыя пазіцыі ва універсітэцкім жыцці, аказваюць ім дзейсную дапамогу: мудрасцю і жыццёвым вопытам выкладчыкаў, зацікаўленасцю маладзёжнымі праблемамі. Партком патрабуе ад партыйных арганізацый развіваць самадзейнасць і самастойнасць камсамола, павышаць адказнасць за навучальны і выхаваўчы працэс.

Камсамол універсітэта дасягнуў высокай арганізаванасці ў правядзенні працоўнага семестра, шэфскай работы, грамадска-палітычнай атэстацыі, палітычнага заліку і ў многіх іншых справах. У перыяд абвастрэння ідэалагічнай барацьбы мы накіроўваем дзейнасць камсамольскіх арганізацый на класавае выхаванне студэнтаў. Адной з форм гэтай работы з'яўляюцца дыскусійныя палітычныя клубы, якія арганізаваны пры кафедрах грамадскіх навук і ў інтэрнатах. Яны заклікаты садзейнічаць не толькі палітычнаму інфармаванню студэнтаў, але і выхаванню ў моладзі абвостранага ідэалагічнага пачуцця да буржуазнай прапаганды, антыподаў камуністычнай маралі, выпрацоўцы палемічнага майстэрства, а галоўнае — ідэйнай перакананасці кожнага ў гістарычнай правамернасці і аб'ектыўнасці развіцця сацыялістычнага грамадства.

Дыскусійныя клубы разлічаны таксама на студэнтаў з іншых краін, якія вучацца ў нашым універсітэце. Дыялог паміж савецкай і замежнай моладдзю дае магчымасць замежным студэнтам падрабязна пазнаёміцца з палітычным курсам КПСС, сацыялістычнай рэчаіснасцю, а таксама ўплываць на іх на аснове прынцыпаў матэрыялістычнай філасофіі і марксісцка-ленінскага вучэння. Кожны ўдзельнік клуба папаўняе свае веды, умацоўвае ідэйную загартоўку.

У гэтай важнай справе камітэт камсамола апіраецца на вопыт старэйшых выкладчыкаў — прафесараў К. К. Германа, Е. Л. Бондараву, У. К. Коршука, А. С. Кляўчэню, В. С. Сцёпіна, А. Я. Супруна, А. М. Шырокава, В. Ф. Цікавага.

Выконваючы пастанову ЦК КПСС, партыйны камітэт БДУ імя У. І. Леніна бачыць сваю задачу ў тым, каб усямерна ўмацоўваць арганізацыйныя і ідэйна-палітычныя пазіцыі камсамольскай арганізацыі, каб у яе радах выхоўваліся кваліфікаваныя спецыялісты, фарміраваліся палітычныя байцы — грамадзяне сацыялістычнай Айчыны.

**М. ДЗЯМЧУК,**
**сакратар парткома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, доктар фізіка-матэматычных навук.**

---

● *Дзейснай формай ідэйна-выхаваўчай работы з'яўляюцца арганізаваныя камітэтам камсамола і кафедрамі гісторыі КПСС і марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў палітычныя клубы «Палітыкус» і «Дыялог», якія дзейнічаюць на базе інтэрната № 1, а таксама клуба «Планета» ў інтэрнаце № 2.*

● *Студэнты універсітэта наведваюць факультэт грамадскіх прафесій. На ФГП працуюць наступныя секцыі і аддзяленні: школа маладога лектара, школа арганізатараў грамадска-палітычнай работы, аддзяленні арганізатараў ваенна-патрыятычнай работы, мастацкага слова, кінааператараў, фотакарэспандэнтаў, харэаграфіі, кройкі і шыцця, інструктараў па спорту, кіраўнікоў агітбрыгад, мастакоў-афарміцеляў.*

# СКРОЗЬ ПРЫЗМУ ЛІЧБАЎ І ФАКТАЎ

● *Надзейнай сістэмай ідэалагічнай работы, што дае магчымасць паспяхова рэалізаваць комплексны падыход да выхавання, з'яўляецца Ленінскі залік і грамадска-палітычная практыка. Яны дазваляюць дабівацца арганічнага спалучэння марксісцка-ленінскага перакanання з практычным удзелам моладзі ў камуністычным будаўніцтве. Камітэт камсамола універсітэта пастаянна ўдасканальвае формы арганізацыі Ленінскага заліку і ГПП. З 1981 года стала традыцыйнай камсамольская атэстацыя студэнтаў. З 1982 года ва універсітэце праводзіцца палітзалік, які з'яўляецца формай супрацоўніцтва камсамольскіх арганізацый і кафедраў грамадскіх навук. У 1984 годзе палітзалік упершыню быў дыферэнцыраваным. Сёлета ўводзіцца асабісты комплексны план удзельніка Ленінскага заліку на ўвесь перыяд навучання ва універсітэце, распрацаваны камітэтам камсамола і саветам па ГПП.*

● *Другі год запар ва універсітэце грамадска-палітычная атэстацыя ўдзельнікаў Ленінскага заліку праводзіцца ў адзін дзень разам са справаздачна-выбарнымі камсамольскімі сходамі ў групах, што садзейнічае арганізацыйна-палітычнаму ўмацаванню камсамольскіх арганізацый, пазбаўляе ад заарганізаванасці і фармалізму.*

● *У БДУ імя У. І. Леніна працуюць 34 калектывы і гурткі мастацкай самадзейнасці. З іх 11 калектываў — агульнауніверсітэцкія. Пяці калектывам прысвоена ганаровае званне «народны»: харавой капэле, тэатру, ансамблю танца, агітбрыгадзе, аркестру народных інструментаў.*

● *У 11 калектывах мастацкай самадзейнасці універсітэта займаецца 514 чалавек. У 23 факультэцкіх калектывах удзельнічае 696 чалавек.*

● *Працуюць аматарскія аб'яднанні і клубы па інтарэсах: клуб самадзейнай песні, клуб навукі і культуры «Красавік» — на базе факультэта прыкладной матэматыкі, літаратурна-творчыя аб'яднанні «Узлёт» на базе філалагічнага факультэта і «Рунь» на базе факультэта журналістыкі.*

---

**● РЭХА ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА ●**

# ЗАЦВЕРДЗІЦЬ СЯБЕ СПРАВАЙ

**На сумесным пасяджэнні рэктарата і камітэта камсамола універсітэта разгледжаны вынікі работы студэнтаў у будаўнічых атрадах і на сельгасработах у 1984 годзе і задачы па падрыхтоўцы да летняга працоўнага семестра 1985 года.**

СОТНІ АБ'ЕКТАЎ вытворчага і культурна-бытавога прызначэння, мільёны рублёў асвоеных капіталаўкладанняў, тысячы лекцый, канцэртаў, а галоўнае — выхаванне ў студэнтаў пачуцця адказнасці за даручаную справу, уменне самастойна вырашаць узнікаючыя праблемы, набыццё навыкаў арганізатара — вось што такое студэнцкія будаўнічыя атрады. Наша краіна рыхтуецца да дастойнай сустрэчы XXVII з'езда КПСС. Уступаючы ў пяты, завяршаючы год XI пяцігодкі, мы можам далажыць, што за гэты перыяд школу будатрадаўскага руху прайшлі 12.254 студэнты, імі асвоена звыш 18 мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў, звыш 300 тысяч рублёў пералічана за дні ўдарнай працы.



У працоўным семестры гэтага года працаваў зводны атрад БДУ імя У. І. Леніна агульнай колькасцю 3.167 чалавек у саставе 106 лінейных атрадаў. Імі асвоена больш як 4 мільёны 100 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, выпрацоўка на аднаго байца склала амаль 4 тысячы рублёў, што на 30 працэнтаў вышэй паказчыкаў першага года пяцігодкі.

Камсамольцы універсітэта па праву ганарацца тым, што партыйныя і савецкія органы бачаць у іх не толькі будаўнікоў, але і актыўных прапагандыстаў і агітатараў. Толькі ў працоўным семестры гэтага года лектарскімі групамі СБА было прачытана 1.608 лекцый, сіламі агітбрыгад дадзена 576 канцэртаў. Байцы СБА прынялі актыўны ўдзел у аперацыі «Памяць», прысвечанай 40-годдзю Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй. Студэнтамі універсітэта адрамантавана 79 помнікаў воінам, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны, а байцамі СБА «Рытм» (юрыдычны факультэт) пабудаваны помнік загінуўшым воінам у вёсцы Заляшаны Клецкага раёна Мінскай вобласці.

Вялікая работа праведзена сельскагаспадарчымі атрадамі. Імі ўбрана 35.717 тон бульбы, 13.444 тоны караняплодаў, перапрацавана 1.635 тон збожжа. Усё гэта—канкрэтны ўклад у рэалізацыю рашэнняў XXVI з'езда партыі, наступных Пленумаў ЦК КПСС, Харчовай праграмы.

Сёлетнія працоўнае лета і восень яшчэ раз пацвярджаюць актыўную жыццёвую пазіцыю нашых камсамольцаў. Хочацца яшчэ раз адзначыць лепшыя атрады: «Маладосць» (механіка-матэматычны факультэт), імя Макаранкі (ФПМ), імя 3 жніўня (юрыдычны факультэт) і многія іншыя.

Бюро камітэта камсамола падвяло вынікі працоўнага семестра і зацвердзіла наступнае размеркаванне месц у аглядзе-конкурсе зводных факультэцкіх атрадаў: 1 — юрфак, 2 — механіка-матэматычны факультэт, 3 — хімфак, 4— ФПМ, 5 — факультэт радыёфізікі і электронікі, 6 — фізфак, 7 — журфак, 8 — геафак, 9 — філфак, 10 — біяфак, гістарычны факультэт зняты са спаборніцтва.

Гаворачы пра поспехі, неабходна спыніцца і на тым, што перашкаджала арганізацыі работы СБА гэтым летам.

Практычна ні на адным факультэце не была наладжана аператыўная сувязь з атрадамі. Камітэты камсамола, прадстаўнікі партыйных арганізацый і дэканатаў факультэтаў не кантралявалі ад'езд атрадаў, не атрымлівалі паведамленняў з месц дыслакацыі СБА. У выніку на дзень ад'езда і да першых праверак часам не было вядома, хто ў атрадзе працуе камандзірам, а хто — камісарам. Што датычыцца падбору кіруючых кадраў для будатрадаўскага руху, то тут у нас таксама яшчэ не ўсё добра. Больш як 20 камандзіраў і камісараў былі заменены на факультэтах пасля зацвярджэння іх на бюро камітэта камсамола універсітэта. У выніку парушэнняў Статута СБА і норм тэхнікі бяспекі ў асобных атрадах мелі месца няшчасныя выпадкі.

І, гаворачы аб задачах на будучы працоўны семестр, неабходна адзначыць, што галоўнае — не дапусціць памылак мінулага лета, выконваць у тэрмін і якасна прымаемыя рашэнні.

На сумесным пасяджэнні рэктарата і камітэта камсамола выступіў камандзір Рэспубліканскага штаба СБА І. І. Шостак.

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
**кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.**

**НА ЗДЫМКУ: выдатна прайшоў трэці семестр у байцоў СБА «Мара» і «Мінск-84», якіх фотакарэспандэнт А. Смольскі сфатаграфаваў на традыцыйным злёце будатрадаў.**

## ДЫЯЛОГІ

# КАЛЕКТЫЎНАЯ АДКАЗНАСЦЬ ГАРАНТУЕ ПОСПЕХ

**За мінулы год па выніках сацыялістычнага спаборніцтва паміж факультэтамі універсітэта камсамольскія арганізацыі ФПМ і мехмата названы лепшымі. А гэта сведчыць аб тым, што камітэты камсамола знайшлі дзейсныя формы і метады работы, змаглі зацікавіць кожнага. Але праблемы, нявырашаныя пытанні застаюцца і ў іх.**

**Дыялог двух камсамольскіх важакоў гэтых факультэтаў — сур'ёзны роздум над зусім не простымі пытаннямі, якія ставіць жыццё перад студэнцкімі камсамольскімі арганізацыямі.**

**В. ЖУК:** Гэтымі днямі прайшла у нас справаздачна-выбарная канферэнцыя. Вядома, што нават самыя вялікія ўражанні з часам згладжваюцца і сціраюцца ў памяці. Але, напэўна, усё жыццё я буду з радасцю ўспамінаць словы першакурсніцы: «Мы самыя шчаслівыя ў гэтай зале, таму што прыйшлі ў вялікую камсамольскую сям'ю, дзе нас, нявопытных «шкаляроў», акружылі клопатам і ўвагай. Вялікае дзякуй!» Некалькі простых, шчырых слоў... А за імі — дні, іншы раз і ночы нястомнай работы над удасканаленнем планаў, падрыхтоўкай да чарговага мерапрыемства...

**Л. ПАНЧАНКА:** А мы пачынаем работу з першакурснікамі яшчэ ў жніўні, у час першай сустрэчы. Выяўляем здольнасці і магчымасці кожнага, цікавімся камсамольскай работай, якую вёў раней, разам шукаем справу, якой камсамолец будзе займацца. Але гэта толькі пачатак. Больш змястоўная размова з першакурснікамі адбываецца на вечары пасвячэння ў студэнты. Праз месяц-другі першакурснік, прыгледзеўшыся да камсамольскага жыцця факультэта, можа выказаць нейкія заўвагі, адзначыць недахопы ў рабоце, з большай упэўненасцю вызначыць, якой справай жадае і зможа займацца. Толькі тады, калі кожны камсамолец будзе лічыць сябе не адзінкай у справаздачы, а сапраўдным стваральнікам, можна быць упэўненым, што справы выконваюцца сумленна.

**В. ЖУК:** Вялікая роля адводзіцца камсоргу. Важна, каб камсоргу верылі, за ім ішлі. Камсорг — гэта сапраўдны сябар, дарадчык, настаўнік, калі хочаце. У ім павінен быць той самы агеньчык, што запальвае ўсіх. Калі ж камсорг забываецца на гэта, лічы, што справы не будзе.

**Л. ПАНЧАНКА:** Мяне даўно турбуе тое, што ўсё часцей сустракаюцца камсамольцы без той самай «іскрынкі ініцыятыўнасці». Яны скептычна глядзяць на ўсе новыя пачынанні і лічаць, што ў наш час праявіць сябе амаль немагчыма. Але нам патрэбна вучыць бачыць рамантыку ў будзённых справах.

**В. ЖУК:** Так, прагу рамантыкі патрэбна рэалізаваць у простых справах. Вось у гэтым годзе мы вырашылі прывесці ў парадак недагледжаныя магілы на ваенных могілках. Будзем весці пошукавую работу.

**Л. ПАНЧАНКА:** Але, згадзіся, наша работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню камсамольцаў не можа зводзіцца толькі да ўрачыстых пасяджэнняў з запрашэннем ветэранаў. Чаму б не сустрэцца з такімі людзьмі ў іх дома, не дапамагчы ў хатніх справах?

**В. ЖУК:** Іменна аб гэтым я і збіралася расказаць. Вось ужо больш чым дзесяцігадовае сяброўства звязвае студэнтаў нашага факультэта і Героя Савецкага Саюза А. В. Кірсанава, удзельніка Вялікай Айчыннай і грамадзянскай войнаў. Кожны год мы ствараем групу, члены якой наведваюць Аляксандра Васільевіча амаль штодня. Дапамагаюць весці перапіску, чытаюць газеты, не забываюцца і на дапамогу ў хатніх справах. Нам вельмі прыемна слухаць успаміны аб яго сябрах, знаёмых і незнаёмых людзях, што прайшлі суровае ваеннае выпрабаванне.

**Л. ПАНЧАНКА:** Мы маем вялікую патрэбу у размовах са старэйшымі таварышамі. І патрэбна адзначыць, што ў нас на факультэце з кожным годам мацнее сувязь у звяне «камітэт камсамола— партбюро». Мы працуем разам, дапамагаючы адзін аднаму. Мы не адчуваем залішняй апекі з боку партыйнага бюро. Словам, нам давяраюць.

**В. ЖУК:** Інакш і немагчыма. Няхай у нас будуць памылкі, няхай не ўсё атрымліваецца з першага разу. Памылкі можна выправіць, а безыніцыятыўнасць нараджае абыякавасць.

**Л. ПАНЧАНКА:** Гаворачы пра няўдачы, мне прыгадалася, як прыйшлі мы ў партыйнае бюро з прапановай аб утварэнні навуковага студэнцкага атрада. Такія атрады ў нашай краіне зарэкамендавалі сябе станоўча. А для нас гэта было справай новай, незвычайнай. І ўсе ж партбюро нас падтрымала: навуковы атрад быў створаны. Яго байцы працавалі ў электронна-вылічальных цэнтрах Мінска. Былі праблемы з жыллём, з арганізацыяй працы, але мы іх адолелі самі. Самае крыўднае, што пра атрад... забыліся. І ў штабе працоўных спраў універсітэта, і у рэспубліканскім штабе СБА. Ніводнага разу ніхто не прыехаў, каб пацікавіцца работай нашых камсамольцаў. Яны апынуліся ў стане рабінзонаў, адарваных ад навакольнага свету.

**В. ЖУК:** Хапае яшчэ ў нас фармалізму, і каб пазбавіцца ад яго, спатрэбіцца шмат часу. Бывае, што цэлы дзень прабегаеш з аднаго пасяджэння на другое. А што ў выніку? Я прытрымліваюся наступнага правіла: выкананне самой справы, сустрэчы з камсамольцамі, а не бясконцыя пасяджэнні рухаюць камсамольскае жыццё наперад.

**Л. ПАНЧАНКА:** А як часам у нас праходзяць камсамольскія сходы! Мала таго, тэмы, якія прапануюцца нам, нярэдка бяруцца невядома адкуль. Выступленні ж падрыхтаваны па схеме: пералічэнне заслуг, крыху крытыкі, нарэшце пажаданні на будучае. Гэтых завучаных папяровых фраз ніхто не слухае.

**В. ЖУК:** Хвароба нашых камсамольскіх арганізацый — шаблонныя камсамольскія сходы. Хаця патрэбна адзначыць, што тут ёсць змены у лепшы бок. Мне, напрыклад, спадабалася практыка правядзення ў адзін дзень справаздачна-выбарнага сходу і грамадска-палітычнай атэстацыі. Але ў мяне ёсць прапановы і заўвагі. Я лічу, што патрэбна ацэньваць актыўнасць камсамольцаў па трохбальнай сістэме: «актыўна», «добра», «пасіўна». І прапанова — праводзіць атэстацыю без камісіі. Дзейнасць камсамольца павінна ацэньваць група, а не члены камісіі, якія не заўсёды добра ведаюць кожнага студэнта. Тады, на маю думку, і размова атрымаецца больш шчырай і адкрытай.

**Л. ПАНЧАНКА:** Калі гаварыць аб усім, што зроблена, патрэбна адзначыць: работа вядзецца вялікая. А колькі спраў яшчэ наперадзе, не злічыць. Ды і не патрэбна гэта рабіць. Галоўнае — не пералік лічбаў і мерапрыемстваў, а іх выніковасць.

Запісала М. ЗАГОРСКАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

## НАСУСТРАЧ ФЕСТЫВАЛЮ МОЛАДЗІ І СТУДЭНТАЎ

*СВЯТА МІЖНАРОДНАГА дня студэнтаў у гэтым годзе праходзіла ў форме мітынгу-канцэрта. Студэнты з Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі сабраліся разам, каб сказаць рашучае «Не!» падпальшчыкам вайны, абмеркаваць свае дзеянні напярэдадні XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве.*

*На двух паверхах галоўнага корпуса размясціўся кірмаш краін свету. Прадстаўнікі розных краін, што вучацца ва універсітэце, знаёмілі студэнтаў са сваёй культурай, бытам. Быў арганізаваны продаж сувеніраў, працавала фотаатэлье. Усе сродкі паступілі ў фонд фестывалю.*

*...У рэзалюцыі мітынгу ёсць такія радкі: «Мы, прадстаўнікі моладзі 80 краін Еўропы, Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, глыбока пераканаоы, што поспех у барацьбе за жыццё на зямлі — за прагрэсіўнымі сіламі, што аб'яднанымі намаганнямі ўсіх міралюбівых народаў можна перамагчы вайну. Наша сіла — у адзінстве! Выдатнай вучобай, ударнай працай сустрэнем Сусветны Маскоўскі фестываль!»*

*...Ляціць песня пратэсту, салідарнасці, міру і дружбы па ўсёй зямлі. Кліча моладзь усіх краін на барацьбу за жыццё!*

І. КЕЗІК,
Н. ТРАЦЦЯК,
студэнткі факультэта журналістыкі.
Фота А. ВАЛОШЫНА.






## РАЗВАЖАЮЦЬ УДЗЕЛЬНІКІ КАНФЕРЭНЦЫІ

# АД СЛОЎ— ДА ДЗЕЯННЯ!

**Зацікаўлена ставяцца да спраў камсамольскай арганізацыі ў партыйным бюро філалагічнага факультэта. Наша размова з сакратаром партыйнага бюро факультэта Мікалаем Рыгоравічам ПРЫГОДЗІЧАМ:**

— Я СТАЎЛЮ ў заслугу камітэту камсамола ўжо тое, што ў тых цяжкіх умовах, якія склаліся на філфаку ў сувязі з праблемай памяшкання (нам даводзіцца займацца ў чатыры змены), ён знаходзіць магчымасць весці работу са студэнцтвам факультэта. Праўда, атрымліваецца гэта не з кожным камсамольцам, але, відаць, тут ужо пралікі самога камітэта камсамола. Больш за ўсё мяне хвалюе інфантыльнасць многіх студэнтаў. Аддаў узносы — і не чапайце мяне больш. Чамусьці так і застаецца камсамолец у баку. Ствараецца ўражанне, што студэнтам патрэбны нянькі ў ролі куратараў. Аб прынцыповасці мы ўспамінаем толькі на камсамольскай атэстацыі. А як ставіцца камсамольская арганізацыя да вучобы? Не сакрэт, што на філфаку не самы лепшы працэнт паспяховасці. Відаць, таму, што мала мы патрабуем з двоечнікаў. Занадта лаяльна ставімся да парушальнікаў дысцыпліны.

**Мікалай Рыгоравіч вельмі крытычна аднёсся да камсамольскай арганізацыі факультэта...**

— Навошта гаварыць пра нашы здабыткі. Іх мы і без таго ведаем, — лічыць М. Р. Прыгодзіч. — Нам патрэбна выпраўляць свае недахопы.

# ПАВЕРЫЦЬ У СВАЕ СІЛЫ

**Слова — сакратару партыйнага бюро фізфака Віктару Анатольевічу ГАЙСЁНКУ:**

— 6 КАСТРЫЧНІКА на факультэце прайшоў справаздачна-выбарны камсамольскі сход. Ён падвёў вынікі работы камсамольскай арганізацыі за год. Так, за гэты час было шмат зроблена, але патрэбна сказаць аб недахопах.

Па-першае, недастаткова ўвагі было ўдзелена рабоце з камсамольскім актывам кафедраў, курсаў, сакратарамі камсамольскіх арганізацый груп. Мала вялася вучоба камсамольскага актыву.

Па-другое, камітэт камсамола ўпускаў з поля зроку пытанні галоўнага абавязку студэнта — вучобы. І як ні дзіўна, а пропускі заняткаў на факультэце — звычайная справа.

Па-трэцяе, як многа мы праводзім мерапрыемстваў з дапамогай куратараў, выкладчыкаў! Становімся апекунамі тых спраў, з якімі камсамольцы могуць справіцца самі. Нам неабходна развіваць студэнцкае самакіраванне.

І, вядома, наперадзе ўсіх спраў павінен быць камітэт камсамола. Думаю, што ён можа справіцца з вышэйназванымі задачамі. Бо ў састаў яго ўваходзяць людзі ініцыятыўныя, дзелавыя. Гэта Анатоль Слабадзянюк, Міхаіл Гольцаў, Святлана Максіменка.

І яшчэ. Вельмі хацелася б, каб увага да камсамольскай арганізацыі фізфака з боку камітэта камсамола універсітэта не абмяжоўвалася толькі ўказаннямі. Патрэбна і канкрэтная дапамога.

# КАНТАКТ? ЁСЦЬ КАНТАКТ!

**Непарыўныя сувязі сумеснай работы існуюць паміж камітэтам камсамола і дэканатам геаграфічнага факультэта. Прадстаўнікі дэканата, члены партыйнага бюро пастаянна прысутнічаюць на камсамольскіх сходах курсаў, асобных груп, прымаюць удзел у пасяджэннях камітэта камсамола.**

— Сур'ёзным недахопам у рабоце камітэта камсамола, — гаворыць Расціслаў Афанасьевіч Жмойдзяк, дэкан геаграфічнага факультэта, — з'яўляюцца недастатковая мэтанакіраванасць і прынцыповасць пры вырашэнні галоўнага пытання— вучобы камсамольцаў, барацьбы за падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў. Мала на факультэце распаўсюджваецца і вопыт выдатнікаў. Затое ў мінулым годзе камітэт камсамола ўдзяліў асаблівую ўвагу рабоце ў групе. За групамі малодшых курсаў былі замацаваны куратары ад камітэта камсамола.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

24 лістапада 1984 г.

Зак. 1865. АТ 10543

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ